гажосць і веліч маральных каштоўнасцей, раскрывае асабістыя перажыванні і пачуцці чалавека. У розных індывідуальна-творчых формах выяўлення ідэйна-мастацкіх пошукаў пісьменнікі прыцягвалі чытачоў суровай праўдай і бескампраміснасцю адзнак, адлюстроўваючы ў сваіх творах не толькі падзеі перыяду Вялікай Айчыннай вайны, але і перажыванні, пачуцці, мары і спадзяванні чалавека на вайне, у тым ліку праз прызму асабістага ўспрымання.

1. *Бондарев, Ю.* Взгляд в биографию / Ю. Бондарев // Собр. соч. : в 4 т. – М., 1970. – Т. 3. – С. 389–390.

2. *Семяжон, Я.* Монголы под Малоярославцем: странички из фронтового дневника / Я. Семяжон // Книга братства. – М. : Улан-Батор, 1971. – 576 с.

3. *Славинский, И.* Дружили два таланта / И. Славинский // Литературная газета. – 2014. – № 13 (6456). – 2 апр. – С. 1.

4. Стэнаграма пасяджэння сімпозіума перакладчыкаў беларускай літаратуры на мовы народаў СССР // БДАМЛІМ. – Ф. 78. – Воп. 1. – Спр. 135.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

***А. М. Пісарэнка,***
*кандыдат філалагічных навук, дацэнт,*
*загадчык кафедры беларускай*
*і замежнай філалогіі*
*Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта*
*культуры і мастацтваў*

## ЛІНГВІСТЫЧНАЯ ІНТЭРПРЭТАЦЫЯ ВОБРАЗА ЛІСТА Ў ПАЭЗІІ У. КАРАТКЕВІЧА

Літаратура як адзін з відаў мастацтва адлюстроўвае свет у вобразах, аднак трансфармацыя слова-паняцця ў слова-вобраз – працэс, у якім задзейнічаны, па-першае, аўтарскае ўспрыманне свету, асацыяцыі творцы, што атаясамляюць разнастайныя з’явы і паняцці; па-другое, у выніку аўтарскіх адкрыццяў, індывідуальных супастаўленняў метафарызацыя актуалізуе незвычайныя пэўныя рысы, характарыстыкі прадмета, якія дапамагаюць у выяўленні агульнай ідэі мастацкага твора, стварэнні мастацкіх вобразаў.

«Вобраз – гэта заўсёды вобраз не сам па сабе, а вобраз чагосьці, бо ён існуе толькі для таго, каб выказаць нешта», у сваю чаргу «вобразы адлюстроўваюць ідэі, гэта значыць адлюстроўваюць свет у асвятленні ідэй» [1, с. 68].

Навакольны свет адметны, разнастайны, і кожная з'ява можа трапіць у поле зроку аўтара-творцы ў розных відах мастацтва. Напоўненая колерамі і формамі, з'явамі і сэнсамі, восень і яе сімвал – жоўты ліст – становяцца аб'ектам «апісання», тлумачэння, мастацкага вобразастварэння; так у музыцы да восені творча дакрануліся А. Вівальдзі, П. Чайкоўскі; у жывапісе – І. Левітан, С. Жукоўскі, С. Бірукоў і інш. Што да мастацкай літаратуры, ліст «залятае» сюды ці ў якасці самастойнага вобраза, ці таго дадатковага фону, на якім адбываюцца падзеі, раскрываюцца аўтарскія пачуцці: *І ўсё патрошку адкрывала: / На дрэве покаўка таўшчала, / ў сабе* ***лісточак далікатны, / Пахучы, свежанькі, прыўдатны*** */ На добрым сонцы гадавала* (Я. Колас); *Завіс на тоненькай галінцы /* ***Сухі, пажоўклы, нежывы****… / А ўжо не спіцца ручаінцы / Пад небам цёплым, паравым. <…> / І льюцца кроплі* [дажджу. – *А. П.*], *быццам слёзы, /* ***Па твары зморшчаным ліста*** (Е. Лось); ***Трапяткімі лістамі*** [асіны. – *А. П.*] *хацелі акрыцца, / Каб не бачыць, як далеч спаўе бліскавіца* (Г. Бураўкін); *Замерлі дрэў макушкі, / Не зварухнецца* ***ліст*** (П. Глебка); *Яшчэ ў пачатку ліпеня бывае* ***зжаўцее адзін-адзінюткі лісток*** *на бярозе, і так ён сярод* ***пышнай зеляніны*** *трымаецца доўга; …****Жоўты лісток*** *з бярозы ляжыць у траве і відзён здалёку, і без яго, здаецца, не пахнуў бы так чабор, не такі прывабны здаваўся б верас і не было б такога вялікага шчасця ў душы бачыць траву і дрэвы, сіратлівы куст шыпшыны і вершаліну высокай хвоі, на якой ціха ляжыць праменне блізкага да заходу сонца* (К. Чорны); ***Ліст раняюць лозы*** (П. Глебка); *Апошнімі маланкамі* [навальніца. – *А. П.*] / ***Абпальвала кляновыя лісты****…* (П. Панчанка).

Восеньская прастора караткевічаўскай лістоты, апісаная ў вершы «Лісце», шматгукавая, яна прыводзіць чытача ў незвычайны аўтарскі свет, насуперак агульнапрынятым уяўленням пра восеньскае шапаткое ціхае падзенне, шаргаценне лістоты: ***Дз**ьмухае ветрык – каляныя **с**ухія лі**с**ты і **заш**ама**ц**я**ц**ь мі**ж** **с**абой: «**Ш**ы, **ш**ы, **ш**ы…» Так у маёй кале**ц**ыі, у маім во**с**ень**с**кім буке**ц**е апынуў**с**я і гэты буры **ш**аптун…* (Р. Ігнаценка); ***З**оркай ін**ш**ага **с**у**с**вету блі**с**нуў кляновы лі**с**т, **ш**то раптам **з'**явіў**с**я пе-*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*рад вачамі на дарозе*; ***Шуміць** лес. **Шамаціць** пад нагамі лісце. Дзіўным веерам – у тры бакі ад **сябе** – насыпала на **яшчэ** зеленаватую траву залатовак прыгажуня-бяроза. Як яны гараць, гэтыя лісцікі – ну, **сапраўды**, як тыя залатоўкі* (І. Шамякін). (Выдзеленыя ў прыведзеных урыўках шыпячыя і свісцячыя гукі дапамагаюць сэнсава-лексічнаму апісанню восеньскай цішы, заміранню прыроды.)

Як адзначаюць навукоўцы, «верш – гэта складана пабудаваны сэнс; гэта азначае, што, уваходзячы ў склад адзінай цэласнай структуры, значныя элементы мовы аказваюцца звязанымі складанай сістэмай суадносін і проціпастаўленняў, немагчымых у звычайнай моўнай канструкцыі [2, с. 48]. Таму караткевічаўскі ліст і тое, аб чым ён распавядае аўтару і чытачу, варта слухаць у шырокім кантэксце ўсяго твора.

Верш «Лісце» У. Караткевіча складаецца з сямнаццаці радкоў; слоў у ім – усяго пяцьдзясят два, і амаль усе яны знамянальныя, насычаныя санорнымі гукамі – без права аглушэння: ***Восень прайшла пералескамі**, / Па **няголеным ржышчы ніў**, / **Чырвонымі арабескамі** / **Лісце лес ураніў**. / **Глянь на зямлю** залатую, / Пяшчотную, сумную, чыстую, / **Нехта па ёй вандруе**, / **Ў паветра** ўзнімаючы лісце. / Струменьчыкам тонкім лісце. / **Медзь на** азёрах сплывае, / **Сум** у **небе** імглістым... / Як песня, з галін злятае / **Лісце, лісце**, / Залацістае лісце, / Сто лісцяў, / Дзесяць лісцяў, / **Ліст**.* Таксама дадаюцца словы з гукам [*й*], які ўзнікае ў выніку расшчаплення галосных (*ю, е, я: залатую, пяшчотную, сумную, чыстую, вандруе, узнімаючы, сплывае, як, злятае, залацістае*).

Звонка ападаюць у восеньскай цішы лісты; аўтарская метафара – *медзь сплывае* – пацвярджае нашу выснову (медзякі звіняць). Свісцячых, шыпячых гукаў у словах менш, яны дамінуюць (у апошніх радках (12–17) пачынаюць пераважаць свісцячыя/шыпячыя гукі над санорнымі: *Як песня, з галін злятае / Лісце, лісце, / Залацістае лісце, / Сто лісцяў, / Дзесяць лісцяў, / Ліст).*

Аб чым звіняць восеньскае караткевічаўскае лісце і апошні ліст?.. Пераносна-вобразнае значэнне большасці слоў верша стварае рухомы малюнак восені: метафары (*восень прайшла пералескамі, лісце лес ураніў, нехта па ёй вандруе, медзь на азёрах сплывае, сум у небе імглістым*); эпітэты: *няголенае*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*ржышча; зямля залатая; пяшчотная, сумная, чыстая* (ампліфікацыя); *імглістае неба, тонкі струменьчык, залацістае лісце*; параўнанні: *лісце чырвонымі арабескамі; лісце, як песня, з галін злятае; лісце струменьчыкам тонкім.* Такі стылістычны прыём, калі нежывая з’ява ў мастацкім кантэксце надзяляецца рысамі чалавека, кваліфікуецца як адухаўленне. Што да стылістычных фігур, то яны з’яўляюцца сродкам стварэння маляўнічасці, таямнічасці прыроды, восеньскага суму, яе гучнай восеньскай цішыні: найперш гэта інверсія эпітэта – *зямля залатая, струменьчыкам тонкім, у небе імглістым;* градацыя: *сто лісцяў, дзесяць лісцяў, ліст* – ад незлічонай колькасці да адзінакавасці з’явы. Адметны факт, што выяўляецца пры аналізе сінтаксічнай будовы верша, – гэта прамы парадак слоў у першых (1–4), а затым 7–10-м радках: там, дзе якраз і дамінуюць санорныя гукі над шыпячымі і свісцячымі; у той час як з 11-га радка пачынае ўсталёўвацца адваротны парадак слоў, менавіта ён і падкрэслівае заміранне прыроды, запаволенасць руху, суцішэнне хады восені.

Гукавы малюнак поўнай восеньскай цішыні праяўляецца ў заміранні прыроды, у яе бязлістай веліччы: пасля заходу – заўсёды світанне; старое лісце ападае, вызваляючы месца наступнай маладой лістоце. У. Караткевіч стварае гукавобразы лісця, якое падае звонка і затым ціха, і восені, што ідзе таямніча, але гучна, і таму відаць і чуваць яе «крокі», якія паступова заціхаюць.

Такім чынам, адметнасць вобраза ліста/лістоў/лістоты відавочная: малыя памерам, магчыма, высахлыя, жоўтыя, яны заключаюць у сабе арыгінальную ідэю, актуалізуюць такі складнік вобраза, які робіць яго непаўторным у кожнай маўленчай сітуацыі, кожным канкрэтным творы. Хараство прыроды фарміруе хараство душы і абуджае самыя нечаканыя эмоцыі, у чым і праяўляецца эстэтычная функцыя слова ў мастацкім кантэксце.

---

1. *Гуковский, Г. А.* Изучение литературного произведения в школе / Г. А. Гуковский. – Л. ; М. : Просвещение, 1966. – 256 с.

2. *Лотман, Ю. М.* О поэтах и поэзии / Ю. М. Лотман. – СПб. : Искусство–СПБ, 1996. – 848 с.

3. *Тынянов, Ю. Н.* История литературы. Критика / Ю. Н. Тынянов. – СПб. : Азбука-классика, 2001. – 512 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ